прэзентацыі

# Адказы на галоўныя пытанні

**Кнігу пра вядомага паралімпійца, грамадскага дзеяча Аляксея Талая, якая атрымала назву «Нязломны», прэзентавалі ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Выданне падрыхтавана Выдавецкім домам «Звязда» пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі.**


*Фота Кастуся Дробава.*

*Валерыя Сцяцко і Аляксей Талай.*

Аляксей Талай — матывацыйны спікер, рэкардсмен свету і Еўропы па плаванні, член Канстытуцыйнай камісіі, бізнесмен і бацька чатырох дзяцей. У 16 гадоў ён падарваўся на міне, якая ляжала ў зямлі з часоў Вялікай Айчыннай вайны. Страціў рукі і ногі, але гэта не перашкодзіла здзейсніць свае мары і дасягнуць поспеху. Журналіст газеты «Звязда» і аўтар кнігі Валерыя Сцяцко правяла з Аляксеем Талаем і людзьмі, якія падтрымлівалі яго на жыццёвым шляху, некалькі месяцаў. У выніку атрымалася новая форма біяграфіі: пра свой лёс расказвае не сам герой, а блізкія яму людзі.

— Калі сярод журналістаў заходзіць размова пра Аляксея, усе пачынаюць пытацца: «Як у яго гэта атрымліваецца?» Я вырашыла адказаць на гэтае пытанне, але спытаць не ў самога Аляксея, а ў тых, хто побач з ім: бацькоў, брата, жонкі, доктара, які выратаваў яму жыццё. І знайшла адказ — сакрэт менавіта ў тым, што побач з ім знаходзяцца гэтыя выдатныя людзі, якія вераць у яго і вельмі любяць, — адзначыла на прэзентацыі Валерыя Сцяцко.

Падчас сустрэчы госці пачулі самыя важныя радкі кнігі. Іх зачытвалі мастацкі кіраўнік Маладзёжнага тэатра эстрады Уладзіслава Арцюкоўская, кіраўнікі рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Патрыёты Беларусі» Сяргей Рачкоўскі, Ганна Харута, Мікалай Зарубіцкі... Завіталі на вечар і вядомыя артысты — вакалістка Маладзёжнага тэатра эстрады Гюнеш, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Жанет, аўтар-выканаўца Цімур Прахін, актрыса, спявачка, арганізатар дабрачынных праектаў Аляксандра Гайдук, арт-група «Беларусы» (кіраўнік — Валерый Шмат).

— У працэсе работы над выданнем мы шмат што зразумелі пра сябе. Уся наша сям'я атрымала каштоўны жыццёвы вопыт, калі пераадольвала ўсе цяжкасці, якія на нас зваліліся. Далей было шмат перамог і грандыёзных здзяйсненняў, але ўспамінаюцца першыя, самыя важныя крокі. Вядома, прыходзілі думкі, што я вінаваты ў тым, што спакойнае жыццё нашай сям'і парушылася. Але я павінен быў, думаючы ў першую чаргу аб сваіх блізкіх, рабіць гэтыя першыя крокі ў новую рэчаіснасць у новым целе. І самае галоўнае — у мяне атрымалася. Сёння я рады таму, што са мной адбываецца, — адзначыў герой кнігі Аляксей Талай.

**Яўгенія ШЫЦЬКА**